# 11 кастрычніка 2024 г. у г. Мінску адбудзецца фінал шостага рэспубліканскага конкурсу "Сям'я года"

Конкурс нясе важную місію, накіраваную на захаванне духоўна-маральных каштоўнасцей сям'і, прасоўванне ў грамадстве ідэі адказнага бацькоўства, прапаганду сярод дзяцей і моладзі сямейнага ладу жыцця.
Арганізатарам конкурсу выступае Міністэрства працы і сацыяльнай абароны з удзелам Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, пры падтрымцы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Беларускага саюза жанчын.
У гэтым годзе акрамя прафесійнага журы, упершыню выбраць лепшую «Сям'ю года» змогуць і інтэрнэт-карыстальнікі.
Галасаванне стартавала 12 верасня і працягнецца па 9 кастрычніка 2024 г. на афіцыйным Telegram-канале Мінпрацы і сацабароны.